Голас Радзімы

№ 23 (1853)
7 чэрвеня 1984 г.

ГАЗЕТА БЕЛАРУСКАГА ТАВАРЫСТВА ПА КУЛЬТУРНЫХ СУВЯЗЯХ З СУАЙЧЫННІКАМІ ЗА РУБЯЖОМ
(БЕЛАРУСКАЕ ТАВАРЫСТВА «РАДЗІМА»)

выдаецца з 1955 г.
Цана 4 кап.

Мякка дакрануўся смычок да струн — запела скрыпка. Да пяшчотнай мелодыі весела далучыўся губны гармонік, і Станіслаў Маленчык, бы той чараўнік, заварожвае слухачоў. Дзе б ён ні выступаў, яго заўсёды прымаюць радасна, апладзіруюць ад душы. Ён зусім не прафесійны артыст. Пра такіх гавораць — самародак. Ніхто і ніколі не вучыў яго іграць на музычных інструментах. Да ўсяго дайшоў сваім розумам. Ды і інструменты ў яго таксама свае, створаныя яго рукамі. Цяга да прыгожага, да музыкі была ў Станіслава з дзяцінства. Яшчэ тады палюбіў ён цудоўныя гукі скрыпкі, а палюбіўшы і зразумеўшы, змайстраваў свой першы інструмент. Іграў на сельскіх вяселлях, святах. Яго музыка памагала аднавяскоўцам пераносіць нягоды, аблягчала аднастайнае, цяжкае сялянскае жыццё пад прыгнётам белапольскіх памешчыкаў. Яго талент, як і таленты соцень самабытных артыстаў, якімі так багата наша зямля, па-сапраўднаму раскрыўся толькі пасля ўсталявання Савецкай улады ў Заходняй Беларусі. Цяпер Станіслаў Маленчык жыве ў Шчучыне, на Гродзеншчыне. Ён актыўны ўдзельнік самадзейнасці Шчучынскага Дома культуры. Разам з гэтым калектывам ён пабываў не толькі ў многіх мясцінах Беларусі, але і ў іншых рэспубліках краіны. І ўсюды самабытнага народнага выканаўцу цёпла сустракалі, радаваліся, слухаючы яго непаўторную музыку.

НА ЗДЫМКУ: іграе С. МАЛЕНЧЫК.

Фота С. КРЫЦКАГА.

УРУЧЭННЕ К. У. ЧАРНЕНКУ ЎЗНАГАРОДЫ СЕНАТА ГЕНЕРАЛЬНЫХ КАРТЭСТАЎ ІСПАНІІ

29 мая ў Крамлі кіраўнік дэлегацыі сената Генеральных картэсаў (парламента) Іспаніі, якая знаходзілася ў СССР па запрашэнню Вярхоўнага Савета СССР, старшыня сената Х. Ф. дэ Карвахаль уручыў Генеральнаму сакратару ЦК КПСС, Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР К. У. Чарненку «Залаты медаль сената Генеральных картэсаў Іспаніі». Гэта ўзнагарода прысуджаецца кіраўнікам дзяржаў за выдатныя заслугі, перш за ўсё ў справе абароны міру. Да гэтага часу яна была ўручана ўсяго толькі двум асобам—каралю Іспаніі Хуану Карласу I і Прэзідэнту Мексіканскіх Злучаных Штатаў.

К. У. Чарненка выказаў удзячнасць за высокую ўзнагароду, якой удастоіў Старшыню Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР сенат Генеральных картэсаў Іспаніі. Успрымаю яе, сказаў К. У. Чарненка, як прызнанне дабратворнага ўздзеяння на сусветныя справы паслядоўнай міралюбівай палітыкі Савецкага Саюза. І ў той жа час як сведчанне прыхільнасці Іспаніі і яе народа справе разрадкі, развіцця мірнага супрацоўніцтва паміж дзяржавамі.

АДКАЗ К. У. ЧАРНЕНКІ

Паважаная пані Петра Келі,

мы падзяляем Вашу заклапочанасць магчымасцю прымянення ядзернай, хімічнай і іншай зброі. Для такой заклапочанасці ёсць усе падставы, тым больш, што сяму-таму хацелася б услед за новымі ядзернымі ракетамі працягнуць у Заходнюю Еўропу, перш за ўсё ў вашу краіну, новыя партыі хімічных боепрыпасаў, а таксама нейтронную зброю.

У сувязі з гэтым дарэчы напомніць аб асаблівай адказнасці тых дзяржаў, на тэрыторыі якіх пачалося або плануецца размяшчэнне новых відаў зброі масавага знішчэння. Адказнасці як за лёс іх уласных народаў, так і за еўрапейскі мір і міжнародную бяспеку ў цэлым.

Вы пытаеце, як выключыць магчымасць прымянення ядзернай або хімічнай зброі супраць ФРГ, якія яна для гэтага павінна выканаць умовы. Умовы, на наш погляд, зводзяцца, па сутнасці, да аднаго: ФРГ ніколі і ні пры якіх абставінах не павінна стаць плацдармам для падрыхтоўкі і ўчынення агрэсіі супраць СССР і яго сацыялістычных саюзнікаў з прымяненнем упамянутых Вамі або іншых сродкаў вядзення вайны. У гэтым выпадку ваша краіна можа быць цалкам упэўнена ў тым, што ёй нішто не пагражае. Можна сказаць, што яна будзе застрахавана ад удару ў адказ.

Хто размяшчае ў сябе зброю першага ўдару, нацэленую на суседнія дзяржавы, той загадзя ставіць сябе пад пагрозу ўдару ў адказ, удару адплаты. Хто іншых ператварае ў мішэнь, той немінуча і сам становіцца мішэнню. Тут павінна быць поўная яснасць.

Каб усе дзяржавы не зведвалі трывогі за сваю бяспеку, трэба паклапаціцца аб тым, каб, як Вы, пані Келі, справядліва лічыце, ліквідаваць усю зброю масавага знішчэння як у вашай краіне, так і наогул на Захадзе і на Усходзе. Савецкі Саюз са свайго боку неаднаразова заяўляў аб сваёй гатоўнасці зрабіць такім чынам, калі і іншыя дзяржавы зробяць гэтак жа.

Мне і іншым дзяржаўным дзеячам нашай краіны прыходзілася ўжо гаварыць аб прынцыповым значэнні, якое мела б гатоўнасць дзяржаў, валодаючых ядзернай зброяй, падпарадкаваць свае адносіны пэўным нормам, няўхільна прытрымлівацца іх у сваёй палітыцы, як гэта ўжо робіць Савецкі Саюз. Напомню толькі некаторыя з іх, якія прама адносяцца да пастаўленых Вамі пытанняў. Савецкі Саюз афіцыяльна і ўрачыста заявіў, што ніколі не прыменіць ядзерную зброю супраць краін, якія адмовіліся ад вытворчасці і набыцця такой зброі і не маюць яе на сваёй тэрыторыі. Больш таго, наша краіна прыняла, прычым у аднабаковым парадку, абавязацельства не прымяняць ядзерную зброю першай. СССР разам са сваімі саюзнікамі па Варшаўскаму Дагавору прапануе краінам НАТО дагаварыцца аб непрымяненні першымі і звычайнай зброі, ваеннай сілы наогул. Наша краіна да гэтага гатова.

Што ж, паўстае пытанне, перашкаджае іншым ядзерным дзяржавам узяць аналагічныя абавязацельствы, калі іх думкі накіраваны на мір, як аб тым заяўляюць іх кіраўнікі? Бо калі не будзе першага ядзернага ўдару, значыць, не будзе і наступных.

Ясна, што ў такіх умовах значна лягчэй было б дагаворвацца і аб мерах па практычнаму скарачэнню, а ў канчатковым выніку поўнай ліквідацыі запасаў ядзернай зброі. Савецкі Саюз прапанаваў рэалістычную паэтапную праграму дасягнення гэтай мэты, маючую глабальны характар.

Што датычыць еўрапейскага кантынента, то і тут СССР прапануе практычныя рашэнні: ад радыкальнага скарачэння ядзерных узбраенняў у адпаведнасці з прынцыпам роўнасці і аднолькавай бяспекі да поўнага вызвалення Еўропы ад ядзернай зброі як сярэдняй дальнасці, так і тактычнай.

Гэтак жа Савецкі Саюз рашуча супраць таго, каб калі-небудзь была пушчана ў ход хімічная зброя. Мы зрабілі канкрэтныя прапановы аб яе выключэнні наогул з ваенных арсеналаў. У якасці аднаго з першачарговых крокаў СССР і іншыя сацыялістычныя краіны прапанавалі дагаварыцца аб вызваленні Еўропы ад усіх відаў хімічнай зброі.

Такая наша пазіцыя. Думаю, яна дае вычарпальны адказ на цікавячыя Вас пытанні. Каб дабіцца рашучага пералому да лепшага, трэба зламаць упарты сабатаж тых, хто адкрыта робіць стаўку на сілу, аб'яўляе прымяненне сродкаў масавага знішчэння людзей «законным» і «маральным» спосабам вырашэння спрэчных пытанняў і дасягнення сваіх палітычных мэт. Дзеля гэтага і расстаўляюць на зямлі заходнееўрапейскіх краін ракеты, прызначаныя для развязвання агрэсіі, увозяць з-за акіяна і складзіруюць тут хімічную зброю.

Такой палітыцы, калі пад еўрапейскі кантынент свядома закладваюць запал ядзернай і хімічнай вайны, павінен быць пастаўлены заслон. Задача перакрэсліць гэтыя злавесныя задумы востра стаіць перад усімі народамі, палітычнымі партыямі і грамадскімі рухамі. І вырашаць яе трэба неадкладна, не шкадуючы намаганняў.

Савецкі Саюз будзе і ў далейшым рабіць усё, што ад яго залежыць, каб дабіцца павароту да нармалізацыі еўрапейскай і міжнароднай абстаноўкі ў інтарэсах забеспячэння міру і бяспекі народаў.

З павагай

К. ЧАРНЕНКА.

* * *

Пасланне К. У. Чарненкі з'яўляецца адказам на зварот грамадскай дзяячкі ФРГ, прадстаўніцы партыі «зялёных» П. Келі, якая ставіць пытанне аб тым, як выключыць магчымасць прымянення ядзернай або хімічнай зброі супраць цэлей у Заходняй Германіі і што павінна быць для гэтага зроблена з боку ФРГ. Адначасова П. Келі выказваецца наогул за ліквідацыю зброі масавага знішчэння.

(ТАСС).

«ВІЗІТНАЯ КАРТКА» ГОРАДА

ЗАХОЎВАЕЦЦА ГІСТАРЫЧНАЕ АБЛІЧЧА

ЧАТЫРЫ ВАРЫЯНТЫ РЭКАНСТРУКЦЫІ

КВАРТАЛЫ СУЧАСНАГА ПІНСКА

Пінск стаў другім пасля беларускай сталіцы горадам, для якога распрацаваны праект рэканструкцыі цэнтра.

Рэгенерацыя ў пінскім варыянце — не столькі аднаўленне, колькі захаванне гістарычных і архітэктурных каштоўнасцей, якімі багаты горад, што ўпершыню ўпамінаецца ў Іпацьеўскім летапісе ў 1097 годзе, і, вядома, прыстасаванне да сённяшніх патрэб тых пабудоў, якія яшчэ не выкарыстоўваюцца. А ў некаторых будзе іншае прызначэнне. Скажам, у калегіуме былога езуіцкага манастыра XVIII стагоддзя, дзе цяпер знаходзяцца ўстановы і мастацкая школа, неўзабаве пасля рэстаўрацыі размесціцца музей сацыялістычнага пераўтварэння Палесся.

У пустуючым цяпер касцёле Карла Бароміўша, пабудаваным у XVIII стагоддзі, мяркуецца стварыць філарманічную канцэртную залу. Палац Бутрымовіча—помнік канца XVIII стагоддзя—ужо аднаўляецца пад гарадскі Палац піянераў.

— Задача не толькі ў тым, каб зберагчы дзесятак-другі унікальных будынкаў. Ніякія помнікі не могуць захаваць індывідуальнасць цэлага горада,—лічыць вядучы архітэктар праекта з навукова-рэстаўрацыйных майстэрань Міністэрства культуры БССР Сяргей Аляксандраў.—Трэба зберагчы тыя гарадскія рысы, у якіх гэтыя помнікі існуюць. Толькі захаваннем і спалучэннем гістарычна каштоўных аб'ектаў і цяперашняй звычайнай забудовы дасягаецца гармонія горадабудаўнічага мінулага і сучаснага.

Сучаснае шматпавярховае будаўніцтва вядзецца ў раёнах, якія прылягаюць да новых прамысловых пляцовак, а цэнтральная частка ў асноўным захавала характар старога малапавярховага горада. Але была пагроза паланення яго акселератамі-мікрараёнамі. У горада, размешчанага на ўрадлівых землях левабярэжжа Піны, зацісненага паміж ракой і трубаправодам, вельмі абмежаваныя магчымасці для расшырэння. Новыя прамысловыя пляцоўкі і жылыя раёны з часам будуць будавацца на намываемых тэрыторыях на правым беразе Піны.

Насельніцтва Пінска ў бліжэйшыя дзесяцігоддзі дасягне 150 тысяч чалавек, а ў перспектыве—чвэрці мільёна. Такі рост ва ўмовах дэфіцыту тэрыторый для новага будаўніцтва, здавалася б, патрабуе большай колькасці вышынных дамоў у малапавярховым сядзібным цэнтры. Але зрабіць так азначала б для Пінска страту гістарычнага аблічча.

Дойліды змаглі «прачытаць» гэтую горадабудаўнічую сітуацыю, калі заняліся карэкціроўкай генеральнага плана развіцця горада. Тады і вырашана было ўключыць у генплан рэгенерацыю цэнтра.

«Візітнай карткай» Пінска будзе вуліца Леніна, якая ператворыцца ў пешаходную. Ажыўленасць яе абумоўлена стварэннем тут сацыяльна-культурнага патэнцыялу, мноствам невялікіх кропак абслугоўвання—магазінчыкаў, салонаў, кафетэрыяў, а таксама зручнымі транспартнымі сувязямі з мікрараёнамі. А вось жылыя і адміністрацыйна-дзелавыя будынкі, якім не абавязкова знаходзіцца ў цэнтры, будуць адсюль паступова пераводзіцца.

Новае жыццё ўвойдзе ў гістарычны цэнтр не буйнымі кварталамі, здольнымі закрыць старое, пакінуўшы толькі яго найбольш яркія фрагменты, а чымсьці больш дробным, што адлюстроўвае даўніну ці адцяняе яе ў выгадным святле.

Архітэктары прыдумалі для гістарычнай зоны Пінска чатыры тыпы кварталаў, чатыры варыянты рэканструкцыі, якія ва ўзаемадзеянні і дадуць новы стары горад.

У першым, які знаходзіцца ў месцы, дзе гістарычная архітэктура страчана ці малакаштоўная, размесціцца новы гандлёвы цэнтр. Але аб'ёмы яго абмяжоўваюцца па вышыні двума паверхамі, каб не высоўваўся са старой забудовы, над якой дамінуюць помнікі. У гэтым квартале захаваны дом мінулага стагоддзя, ужо рэстаўрыраваны пад шахматна-шашачны клуб. Гэты будынак падказаў матыў фасадаў гандлёвага цэнтра. Завяршаючы сучасную бойкую магістраль, ён служыць паваротам да гістарычнай зоны і адначасова экранам, які засланяе пешаходную эспланаду ад шуму індустрыяльнага горада.

Не пазбаўлены такой ролі і квартал, які мяркуецца насупраць калегіума, каля моста. Цяпер гэтае месца мае непрыгожы выгляд. Але яно будзе забудавана выцягнутым малапавярховым будынкам турысцкай гасцініцы, што паслужыць і афармленнем аднаго з галоўных уездаў у горад, і забудовай набярэжнай, якая не будзе абрывацца пустэчай.

Трэці варыянт прызначаны для той часткі гістарычнай зоны, дзе цяпер пераважае індывідуальная забудова. Тут і характар яе трэба захаваць, і дабіцца высокай шчыльнасці жылля. Дасягненне гэтых, здавалася б, супярэчлівых вынікаў цалкам рэальнае. Беларускія архітэктары распрацавалі серыю невысокіх цагляных дамоў для гістарычных цэнтраў, якая дазваляе дасягнуць шчыльнасці забудовы не меншай, чым у панельным мікрараёне. А ў захаваных аднапавярховых будынках можна размясціць пункты для абслугоўвання жыхароў квартала—прадуктовую краму, невялікі клуб і да т. п.

Прадоўжыўшы падарожжа, мы трапім у квартал, цэнтр якога—бульвар, што вядзе з новых раёнаў горада да набярэжнай. На адным яго баку захоўваюцца старыя дамы, якія будуць скарыстаны пад кафэ, іграткі, більярдныя... У канцы бульвара—тэатр.

Усе разам гэтыя кварталы ствараюць лірычны, прывабны вобраз цэнтра. Гістарычная зона будзе падобна на малапавярховы партэр, які адным бокам звернуты да ракі, а з астатніх трох агароджаны ансамблямі шматпавярховай сучаснай забудовы.

Праектанты прапаноўваюць таксама пабудаваць побач з гістарычнай зонай пасажырскі порт, а на месцы грузавога рачнога порта—яхт-клуб. Праект прадугледжвае правесці рэканструкцыю цэнтра Пінска да 2000 года.

Пётр БУРАК.

І НА КУХНІ, І Ў ДОМЕННАЙ ПЕЧЫ

ПРЫРОДНЫ ГАЗ

— Ці ведаеце вы, як выглядае прымус, газоўка, керагаз!— спытаў я ў некалькіх маладых людзей, збіраючыся пісаць гэты артыкул. Амаль усе адказы, як я і меркаваў, аказаліся адмоўнымі. Пакаленне 20-гадовых у Савецкім Саюзе бачыла гэтыя прадметы быту хіба што ў самым раннім дзяцінстве.

Больш за 210 мільёнаў чалавек у СССР — амаль тры чвэрці насельніцтва краіны — карыстаюцца сёння ў быце прыродным газам. Наўрад ці, падносячы запалку да гарэлкі, людзі пры гэтым задумваюцца аб карэнных пераменах у паліўна-энергетычным балансе краіны, якія адбыліся ўсяго за 2—3 дзесяцігоддзі.

ВЫТОКІ ГАЗАВЫХ РЭК

Савецкі Саюз — адзіная з буйных прамысловых дзяржаў свету, якая поўнасцю забяспечвае сябе ўласнымі энергарэсурсамі. У чым «сакрэт» такой унікальнасці? Не толькі ў наяўнасці адпаведных рэсурсаў, але і ў планавым характары іх асваення. Перш чым пачаць здабычу таго ж прыроднага газу, яго трэба знайсці. Як у пошукі, так і ў распрацоўку радовішчаў, натуральна, патрабуецца ўкладваць вялікія сродкі.

Да другой сусветнай вайны прыроднага газу ў краіне здабывалі мала. Галоўнымі відамі паліва тады былі вугаль, нафта (у быце — газа), дровы, торф.

60-я гады сталі часам хуткага нарошчвання здабычы прыроднага газу — з 45 мільярдаў кубічных метраў у 1960 (7,9 працэнта ў паліўным балансе) да 198 мільярдаў кубічных метраў у 1970 (19,1 працэнта). Здабыча працягвала хутка ўзрастаць і ў наступны перыяд. У 1982 годзе яна перавысіла 500 мільярдаў кубічных метраў. Сёння доля газу ў паліўным балансе краіны роўная прыкладна 30 працэнтам.

Газавыя месцараджэнні маюцца ў розных рэгіёнах: у Туркменіі (Сярэдняя Азія), на Паўночным Каўказе, Украіне, на Каспіі... Галоўныя запасы прыроднага газу — у нетрах Заходняй Сібіры.

Яшчэ ў XVIII стагоддзі вялікі рускі вучоны Міхаіл Ламаносаў прадказваў, што магутнасць Расіі будзе расці пры дапамозе Сібіры. Прароцтва стала па-сапраўднаму ажыццяўляцца толькі ў наш час, калі краіна пачала планамернае асваенне яе прыродных рэсурсаў. Газ і нафту гэты суровы край доўга хаваў ад чалавека. Многагадовыя іх пошукі ў тайзе і балотах каштавалі нямала. Ва ўмовах бездарожжа, карыстаючыся аднымі рэкамі ды паветраным транспартам, даводзілася дастаўляць у глухія, неабжытыя мясціны грувасткае буравое абсталяванне і ўсё неабходнае для жыцця першапраходцаў.

Многія аўтарытэтныя спецыялісты выступалі за спыненне пошукаў. Аптымістам было нялёгка даказваць неабходнасць працягу разведачных работ.

У 1953 годзе ў Заходняй Сібіры забіў першы газавы фантан, у 1960 годзе — першы нафтавы. Пасля гэтага там стаў хутка стварацца магутны паліўна-энергетычны комплекс. Удзельнічалі ў гэтым больш за паўмільёна чалавек. У Цюменскай і Томскай абласцях у найкарацейшы тэрмін выраслі новыя гарады, пракладзены чыгункі і аўтамабільныя дарогі, працягнуты лініі электраперадач, створаны буйныя порты.

У 1970 годзе здабыча нафты (уключаючы газавы кандэнсат) дасягнула ў Заходняй Сібіры 31 мільёна тон, у 1980 перавысіла 312 мільёнаў тон, у 1985 годзе намячаецца здабыць 385—395 мільёнаў тон.

Яшчэ больш уражваюць лічбы па прыроднаму газу: у 1970 годзе з нетраў гэтага рэгіёна было здабыта 9,5 мільярда кубаметраў прыроднага газу, у 1980 — 156 мільярдаў, а ў 1985 плануецца здабыць ужо 330—370 мільярдаў кубаметраў.

АДЗІНАЯ СІСТЭМА ГАЗАЗАБЕСПЯЧЭННЯ

Сферай быту, зразумела, прымяненне блакітнага паліва ў СССР не абмяжоўваецца. З яго выкарыстаннем сёння выплаўляецца больш чым дзевяць дзесятых усёй сталі і чыгуну, вырабляецца 60 працэнтаў цэменту. Газ — важная сыравіна для хімічнай прамысловасці.

Нафта- і газаперапрацоўчыя галіны прамысловасці развіваюцца і ў Заходняй Сібіры, і ў іншых рэгіёнах азіяцкай часткі краіны. Там жа расце хімічная вытворчасць. У той жа час галоўным спажыўцом сібірскага газу з'яўляецца еўрапейская частка СССР.

Для зручнасці выкарыстання прыроднага газу ў краіне створана адзіная сістэма газазабеспячэння, якая ўключае ў сябе 190 месцараджэнняў, падземныя сховішчы, сетку магістральных трубаправодаў агульнай працягласцю больш чым 140 тысяч кіламетраў.

Для дастаўкі газу з Сібіры ў цэнтральныя і заходнія раёны краіны, а таксама на экспарт на бягучую пяцігодку (1981—1985) было намечана пабудаваць пяць буйных магістральных газаправодаў Заходняй Сібіры ў цэнтр і экспартны Урэнгой — Памары — Ужгарад, больш вядомы за мяжой як газаправод Сібір — Заходняя Еўропа. Іх агульная працягласць — звыш 20 тысяч кіламетраў. Чатыры газаправоды, уключаючы экспартны, ужо збудаваны.

Нягледзячы на аб'яўленае прэзідэнтам ЗША Р. Рэйганам эмбарга на пастаўку для экспартнага газаправода тэхнікі і абсталявання па кантрактах «газ — трубы», заключаных СССР з шэрагам заходніх краін, ён быў пабудаваны на паўгода раней намечанага тэрміну.

Па сваіх тэхнічных параметрах гэты экспартны газаправод перавышае ўсе пракладзеныя раней як у Савецкім Саюзе, так і ў іншых краінах. Яго працягласць — 4 451 кіламетр, дыяметр труб — 1 420 міліметраў, рабочы ціск — 75 атмасфер, прадукцыйнасць — 32 мільярды кубічных метраў газу ў год.

Поўным ходам вядзецца збудаванне далейшага адрэзка гэтай магістралі — па тэрыторыі Чэхаславакіі. Там пракладваецца «нітка» газаправода даўжынёй 860 кіламетраў ад заходняй граніцы СССР да граніцы Чэхаславакіі з ФРГ. Транзіт савецкага газу праз сваю краіну для чэхаславакаў — справа звычная. Па трох магістральных трубаправодах, пабудаваных раней, сёння транзітам праз Чэхаславакію на Захад перадаецца 23 мільярды кубічных метраў газу ў год.

Значэнне прыроднага газу ў савецкай эканоміцы будзе ўзрастаць. У 1983 годзе прырост першасных энергетычных рэсурсаў у краіне склаў 41 мільён тон умоўнага паліва. Як падкрэсліў міністр газавай прамысловасці СССР В. Дзінкоў, 85 працэнтаў гэтага прыросту прыпадае на долю прыроднага газу.

Аляксей ДУМАЎ.

ЛЬНЯНЫЯ ТКАНІНЫ З ОРШЫ

Штогод 10 чэрвеня ў нашай краіне адзначаецца Дзень работнікаў лёгкай прамысловасці. У Беларусі гэтая галіна народнай гаспадаркі адна з найбольш развітых. На яе прыпадае больш за 20 працэнтаў усёй валавой прадукцыі, якую вырабляе рэспубліка.

У шэрагу буйнейшых прадпрыемстваў лёгкай прамысловасці стаіць і Аршанскі льнокамбінат. Тут выпускаюцца бытавыя (дэкаратыўныя, на адзенне, абрусы, сурвэткі, капы, ручнікі), тэхнічныя і тарныя тканіны. Частку прадукцыі прадпрыемства экспартуе за мяжу, у тым ліку ў краіны — члены Савета Эканамічнай Узаемадапамогі, Швецыю, Фінляндыю.

Колькасць вырабаў, выпускаемых Аршанскім льнокамбінатам, пастаянна расце, паляпшаецца іх якасць. Сёлета прадпрыемства амаль на трэць абновіць асартымент сваёй прадукцыі, у вытворчасць будзе ўкаранёна звыш трыццаці новых малюнкаў тканін. Павышэнню эфектыўнасці вытворчасці спрыяе ўстаноўка новага і мадэрнізацыя дзеючага абсталявання, а таксама ўкараненне новых форм арганізацыі працы.

НА ЗДЫМКАХ: адна з лепшых ткачых Аршанскага льнокамбіната Галіна ГАЛУБОВІЧ; брыгада матальшчыц, якую ўзначальвае Вячаслаў ЦАПІН.

Фота А. ТАЛОЧКІ.

ПАСЁЛКІ З ГАРАДСКОЙ «ВЫКРАЙКАЙ»

ШТО ЧАКАЕ ВЁСКУ

Цяпер, калі ад балот, што займалі значную частку тэрыторыі Беларусі, адваяваны вялікія плошчы, з'явілася магчымасць стварэння замест шматлікіх хутароў і невялікіх вёсак — кампактных, з усімі бытавымі зручнасцямі аграгарадоў. У 1966—1980 гады ў сельскай мясцовасці быў пабудаваны 21 мільён квадратных метраў сучаснага жылля. За 1981—1990 гады плануецца здаць у эксплуатацыю яшчэ 12,5 мільёна. Гэтага дастаткова на трохмільённае сельскае насельніцтва рэспублікі, лічаць спецыялісты, мяркуючы, што сёння больш важны паказчык якасны.

Што ж такое сучасныя аграгарады?

Я пабываў у адным з іх — саўгасе «Малеч», які размешчаны на Брэстчыне, у глыбіні беларускага Палесся. Усё забудаванае тут створана для чалавека, і як «суб'екта» вытворчасці, і як спажыўца сацыяльных даброт. Вытворчыя магутнасці — механізаваныя малочнатаварныя фермы, свінагадоўчы комплекс, тэхнічныя майстэрні, сянажныя вежы, тэхналагічныя лініі па апрацоўцы, захоўванню насеннага, фуражнага збожжа і многае іншае — размешчаны на адным «пятачку» непадалёку ад жылой зоны.

У жыллёвым будаўніцтве перавага аддадзена двух- і трохпакаёвым дамам. Падсобныя памяшканні і прысядзібныя ўчасткі аднесены за межы пасёлка. Каля дамоў пакінуты ўчасткі толькі для кветак і фруктовых дрэў. Мясцовыя жыхары з гордасцю паказвалі школу, дом культуры, камбінат бытавога абслугоўвання, рэстаран, кафэ, гасцініцу.

— «Малеч» — мадэль беларускай вёскі, яе зусім блізкая будучыня, — пракаменціраваў мае ўражанні Уладзімір Сакалоўскі, дырэктар інстытута, які праектуе будаўніцтва на вёсцы. — Мы ў свой час правялі сацыялагічныя даследаванні і высветлілі, што цяпер сяляне хочуць жыць і ў гарадскіх умовах, і «ў прыродзе». Так нарадзілася ідэя сельскіх аграпрамысловых агламерацый на 11—15 тысяч жыхароў кожная. Завершана нядаўна распрацоўка схем раённай планіроўкі калгасаў і саўгасаў па ўсёй рэспубліцы. Рэалізаваўшы яе, мы «звядзём» 36 тысяч невялікіх вёсак у 2,5 тысячы пасёлкаў гарадскога тыпу.

Кожны такі аграгарад разглядаецца як адзіная тэрыторыя радыусам 5—6 кіламетраў. Вакол яе размесцяцца 6—7 населеных пунктаў на адлегласці 10—12 кіламетраў ад цэнтральнай сядзібы. Да работы людзі змогуць дабірацца на грамадскім і асабістым аўтатранспарце за 10—15 хвілін. Культурнае і бытавое абслугоўванне пасёлкаў з гарадской «выкрайкай» лёгка арганізаваць па сучаснаму стандарту: кінатэатр, бальнічны цэнтр, школа з кабінетнай сістэмай навучання, музычная школа, бытавы камбінат з поўным наборам паслуг, дзіцячыя сады, Палац спорту з плавальным басейнам, рэстаран. Такія аграгарады растуць у Беларусі ў гістарычна вызначаных кутках «прыцяжэння» сельскага насельніцтва. Як правіла, яны выгадна геаграфічна размешчаны сярод прыгожай прыроды і помнікаў даўніны.

— У гэтай праблемы ёсць і іншы бок, — гаворыць Уладзімір Сакалоўскі. — Я маю на ўвазе перабудову мыслення беларускага селяніна, «уцягнутага» ў буйную сельскагаспадарчую вытворчасць, немагчымую без раздзялення працы і спецыялізацыі. Селянін павінен дасканала асвоіць любую галіну гэтай вытворчасці, стаць майстрам сваёй справы — аператарам жывёлагадоўчага комплексу, жывёлаводам-механізатарам, машыністам кормазавода і гэтак далей. Тады, стаўшы на адзін узровень з тэхнічным прагрэсам, ён і сам зможа істотна ўплываць на яго паскарэнне. Гэта і ёсць, на мой погляд, галоўнае, што збліжае сёння горад з вёскай, здымае адрозненні паміж імі.

Рыгор КОЛАБАЎ.

ЛУЧШЕ—УВИДЕТЬ

«Я чувствовала себя как дома», — сказала нашему корреспонденту Джун Мэка — член русско-американского женского общества, которая недавно побывала в Минске.

Эта уже немолодая женщина прилетела к нам в гости из-за океана. Нашу республику она посетила впервые. Правда, в 1971 году Джун Мэка приезжала в Советский Союз, но побывать в Белоруссии ей тогда так и не удалось: очень насыщенной была программа.

— Но в этот раз, — говорит Д. Мэка, — я решила обязательно приехать к вам, приехать на свою родину. Многие в Чикаго мне говорили, что Белоруссия прекрасна и удивительна, прекрасен ваш город Минск. И это действительно так. Я увидела чистый, красивый город, доброжелательный и гостеприимный народ. Все дни, проведенные здесь, я чувствовала себя как дома...

Джун Мэка — активистка русско-американского женского общества, член других организаций наших соотечественников за рубежом. Она родилась уже там, в Америке, в семье эмигрантов из России: отец —белорус, мать — украинка. Родители, покинув родную землю в детстве, так и не смогли больше увидеть ее. Приехала дочь.

Джун интересовало буквально все. За время своего пребывания в Белоруссии она стремилась как можно больше увидеть, ближе узнать людей, которые утром отправляются на работу, а вечером спешат в театр, кино, на футбольный матч...

— Мне нравилось просто ходить по улицам, смотреть на людей, говорить с ними, —делится своими впечатлениями Д. Мэка. — В субботний день я случайно попала на антивоенную манифестацию. Сто тысяч женщин (!) вышли на улицы Минска, чтобы сказать свое решительное «Нет!» войне, «Нет!» атомному оружию на нашей планете. В Чикаго мне, конечно, тоже доводилось принимать участие в антивоенных демонстрациях, но в такой многолюдной манифестации я участвовала впервые. И слова мира здесь звучали как-то по-особому, чувствовалось, что говорят люди, которые на собственном опыте испытали, какие ужасы несет человечеству война.

На Западе очень мало знают о войне советского народа против фашизма,— продолжает Д. Мэка.— Буржуазная пресса об этом просто не говорит и вообще считает, что тема минувшей войны давно устарела. Нередко даже обвиняют советских писателей в том, что они, дескать, очень уж много пишут о второй мировой войне, а это будто бы всем уже надоело. Мне думается, если бы кто-то из этих «обвинителей» побывал в Хатыни, где увековечены 619 белорусских деревень, сожженных фашистами вместе с людьми, он вряд ли стал бы утверждать, что об этом надо забыть. Нет, о Великой Отечественной войне, вообще о второй мировой войне не перестанут писать и после нас, потому что победа в ней над фашизмом во многом определила судьбу мира...

Писать или не писать о минувшей войне — это решим мы сами. В борьбе с фашизмом мы потеряли 20 миллионов жизней, американцы — 400 тысяч человек. На каждых 50 погибших советских людей приходился один американец (этот факт, хотя и с неохотой, но признают и буржуазные историки). И грош нам цена, если мы забудем хотя бы одного человека, заплатившего своей жизнью за сегодняшний мирный день. Те сто тысяч женщин, с которыми Джун Мэка прошла по улицам Минска, помнят, какой дорогой ценой досталась нам победа над фашизмом. Об этом помнят все советские люди. И эта память заставляет нас бороться за мир на планете.

Сейчас, когда антивоенное движение на нашей планете приобретает все большую силу, буржуазная пропаганда, ставящая своей целью подорвать авторитет этого движения, выдвигает тезисы о том, будто такие выступления организуются «агентами Кремля», а в СССР вообще не ведется борьба за мир. Они упорно твердят, что массовые акции борцов за мир финансируются Советским государством.

Но подобные вещи моей собеседнице были не в новинку. Джун Мэка лучше моего знает, о чем пишут буржуазные газеты. Правда, этой писанине верит все меньше и меньше людей на Западе. Иначе вряд ли бы стали члены русско-американского женского общества и ассоциации Гумбольдт-парка в Чикаго жертвовать свои трудовые деньги в Советский фонд мира. От их имени Джун Мэка внесла в фонд 100 долларов и еще 50 долларов передала на строительство в Москве мемориала Победы советского народа в Великой Отечественной войне. Вот эти добровольные взносы в Фонд мира и есть те «деньги Советского государства», которыми финансируется антивоенное движение в нашей стране, на которые строятся больницы во Вьетнаме, пострадавшем от американской агрессии, на которые оказывается помощь детям Никарагуа и Палестины... И мы очень рады, что в этом благородном деле участвуют и наши соотечественники, живущие за рубежом.

Мы рады, что там, в далекой Америке, есть близкие по духу нам люди, которые в чужеродном окружении стараются сохранить свой язык, национальную культуру, которые помнят и любят свою Родину. Нам также приятно, что гостившая у нас Джун Мэка осталась очень довольна своей поездкой в Белоруссию. Многое, что она увидела и узнала за эти четыре дня, несколько даже удивило ее. Например, в разговорах Джун часто слышала слово «дача». Вначале не понимала, о чем идет речь. Но когда ей объяснили, что так у нас называют загородный летний дом, куда люди обычно уезжают отдыхать в выходные дни и который в состоянии построить любая рабочая семья, восхищенно сказала: «О, в Америке это могут позволить себе только очень богатые люди!»

Но это лишь деталь беседы. Подобных восклицаний было немало. Многие привычные для нас явления вызывали у Джун удивление. Ведь не зря она сказала: «Все, что я увидела в Советском Союзе, не имеет ничего общего с тем, что говорят на Западе о жизни в вашей стране». Так что права пословица: «Лучше один раз увидеть, чем сто раз услышать».

Игорь ГЕРМЕНЧУК.

На просторах Родины

Михайловское, Тригорское, Петровское, городище Воронич и Савкина Горка, Светлогорский монастырь с могилой великого русского поэта. Эти дорогие сердцу места составляют ныне Государственный музей-заповедник А. Пушкина.

Здесь поэт бывал в 1817 и 1819, затем провел «изгнанником два года незаметных» в 1824—1826 годах, сюда стремился, чтобы насладиться покоем и волей, «ближе к милому пределу» завещал похоронить свой прах.

Псковская природа вдохновляла Александра Сергеевича. «Приют спокойствия, трудов и вдохновенья»,— говорил поэт о Михайловском, где им были написаны «Борис Годунов», центральные главы «Евгения Онегина», «Граф Нулин» и многие другие произведения.

Много утекло воды с тех пор в голубой Сороти, петляющей между холмами в Пушкиногорье, старые дубы в Тригорском парке многократно меняли наряд, но все, что связано с близким всем нам именем, сохранено и восстановлено.

«Мельница крылата», не раз упоминавшаяся поэтом в его произведениях, вновь стоит на прежнем месте. Старый дедовский дом в Михайловском, в котором жил А. Пушкин, предстает сейчас в своем первоначальном виде. Воссоздан и кабинет поэта. Все так же красива Липовая аллея, или, как ее называют еще, «Аллея Керн».

Миллионы людей приходят в музей-заповедник, чтобы отдать дань всенародной любви великому поэту, сердцем прикоснуться к местам, которые его вдохновляли.

НА СНИМКАХ: «Аллея Керн»; директор Пушкинского музея-заповедника Герой Социалистического Труда Семен ГЕЙЧЕНКО; на могиле А. Пушкина; в кабинете поэта.

Фото В. ШУБЫ.

ГОСЦІ СА ШВЕЦЫІ

У канцы мая гасцямі Беларускага таварыства «Радзіма» была група нашых суайчыннікаў са Швецыі — прадстаўнікоў рускага таварыства «Привет» на чале са старшынёй праўлення і фінансавым сакратаром гэтай арганізацыі Ахмедам Саітавым.

«Привет» у Мінску прымалі ўпершыню. Таварыства гэтае параўнаўча маладое. Нарадзілася яно ў 1979 годзе ў Стакгольме. Напачатку аб'ядноўвала ўсяго некалькі дзесяткаў чалавек. Кожны год прыходзілі ўсё новыя і новыя людзі. Сёння гэта ўжо вялікая арганізацыя.

Кожную суботу яны збіраюцца разам. Сумаваць не даводзіцца. Гэтыя гадзіны для іх самыя радасныя, бо тут сябры, тут роднае асяроддзе. Час звычайна праводзяць змястоўна: наладжваюць літаратурныя вечары, на якіх чытаюць Лермантава і Цютчава, Блока і Ясеніна, арганізоўваюць цікавыя сустрэчы і канцэрты. Традыцыяй стала ўжо адзначаць савецкія святы: гадавіну Кастрычніцкай рэвалюцыі і Дзень Перамогі, абавязкова святкуюць Першамай, Міжнародны жаночы дзень. І, зразумела,—навагодняя ёлка для дзяцей з Дзедам Марозам і Снягуркай. У такія дні людзей збіраецца больш чым звычайна, бо прыходзіць многа гасцей.

«Привет» таксама налажвае сяброўскія кантакты і абменьваецца дэлегацыямі з арганізацыямі нашых суайчыннікаў у іншых еўрапейскіх краінах, у прыватнасці, з Рускім культурна-дэмакратычным саюзам у Фінляндыі.

Нашу рэспубліку, як мы ўжо сказалі, прадстаўнікі «Привета» наведалі ўпершыню. Таму, зразумела, уражанняў было многа. Дадзім слова нашым гасцям.

Ахмет САІТАЎ: «Перш-наперш хачу падзякаваць таварыству «Радзіма» за цеплыню і гасціннасць, з якой нас сустракалі ў Беларусі. Усё было выдатна арганізавана, нам прапанавалі цікавую і насычаную праграму. Нават не верыцца, што за тры дні можна пабачыць так многа. Мы вяртаемся дадому з самымі лепшымі ўражаннямі».

Галіна РЭЙМАН: «Паездка была вельмі карысная. Мы як бы нанова адкрылі для сябе Беларусь—рэспубліку высокаразвітай эканомікі, навукі і культуры, пазнаёміліся з вашымі музеямі, славутасцямі Мінска і наваколляў беларускай сталіцы. Больш за ўсё запомніцца, зразумела, Хатынь. І запомніцца, напэўна, назаўсёды—як праклён вайне, як напамінак змагацца за мір».

Николай СТАШКЕВИЧ

ТУПИКИ СОВЕТОЛОГИИ

В ИЮНЕ 1982 года американский президент Р. Рейган, выступая в британском парламенте, провозгласил начало нового «крестового похода» против коммунизма. Объявив нашу страну «царством зла» и предав анафеме, он призвал союзников США к совместным действиям против мира социализма. Этот призыв достаточно ясно раскрывает истинные цели империализма, прежде всего — американского. Как выразился сам президент, задача заключается в том, чтобы «оставить марксизм-ленинизм на пепелище истории».

Инициаторы «крестового похода», начав «психологическую войну», предпринимают массированные, в некотором отношении беспрецедентные атаки на социализм, на марксистско-ленинскую идеологию. И это не случайно. Если мы обратимся к трудам В. И. Ленина, то найдем актуальный и для нашего времени анализ перспектив развития революционной борьбы: «На нашей революции больше, чем на всякой другой, подтвердился закон, что сила революции, сила натиска, энергия, решимость и торжество ее победы усиливают вместе с тем силу сопротивления со стороны буржуазии». Этот ленинский вывод подтверждается всем ходом развития революционной борьбы. Мировой империализм, отступая под натиском революционного и национально - освободительного движения, вынужден мобилизовать все свои силы и средства, чтобы остановить развитие прогрессивных сил мира. В этой борьбе империализм открыто провозглашает свою цель: разрушить общественную систему в социалистических странах, повернуть вспять ход истории.

Главной мишенью в идеологической борьбе двух миров капиталистический Запад избрал национальный вопрос. Ожесточенные атаки ведутся на национальную политику КПСС и Советского государства, нашедшую блестящее воплощение в Союзе Советских Социалистических Республик. Исторический опыт КПСС в осуществлении национальной политики указывает всем народам мира пути борьбы за социальный прогресс, подлинное равенство и свободу.

Именно это и вызывает бешенство в лагере империализма. Его идеологи всячески пытаются опорочить наш строй, ослабить притягательную силу советского опыта, отрицать гуманистическую сущность социализма. В клевете на Советский Союз, на политику КПСС упражняются как профессиональные историки, «социологи-теоретики», политологи, так и буржуазные националисты-эмигранты, нашедшие приют и покровительство на Западе.

Ежегодно различные «исследовательские» центры США, ФРГ, Канады, Англии, Франции выпускают множество книг, статей, проводят конференции и симпозиумы, посвященные советской национальной политике. Только в США имеется около 150 так называемых «научно-исследовательских» учреждений, занимающихся изучением Советского Союза, точнее — фальсификацией его истории, в том числе и национального вопроса. Там подвизаются сотни «специалистов», изобретающих различные проекты и концепции, разрабатывающих сценарий разложения социализма изнутри.

В системе этих учреждений действуют и «научные центры» белорусской националистической эмиграции. За претенциозными вывесками так называемого «Белорусского института науки и искусства» в Нью-Йорке (первоначльно назывался «Белорусская свободная академия науки и искусства»), «Белорусского института науки и искусства в Канаде» (БИНИК), «Кривичского научного товарищества имени Франциска Скорины», «Великолитовского (белорусского) фонда имени Льва Сапеги» скрываются влачащие жалкое существование на подачки империалистических спецслужб националистические пропагандистские центры. Они-то и ставят своей задачей повлиять на умонастроение белорусов, влить в их души недоверие и неприязнь к русскому и другим народам СССР, к самому социалистическому строю. Вокруг таких советологических «научно-исследовательских» центров концентрируется немало темных личностей — бывших предателей, активно сотрудничавших с фашистами в годы минувшей войны, а в послевоенный период ставших холопами идеологических и разведывательных служб капиталистического Запада. При поддержке официальных властей США бывшие нацистские пособники из белорусских националистов сколотили даже организацию, призванную противодействовать разоблачению их преступного прошлого. Она получила название «Белорусско-американская коалиция противодействия клевете». Создание такой организации не случайно. Возникла она как лихорадочная реакция преступников на их разоблачения, сделанные известным американским юристом Джоном Лофтусом. Но опасаться националистам нечего: таких людей в Америке в обиду не дают.

Представители националистической реакционной эмиграции принимают активное участие в деятельности многочисленных русских «институтов и исследовательских центров» при университетах США. Они часто задают тон на различных конференциях и симпозиумах по «проблемам изучения советских национальных отношений», в антисоветских кампаниях вроде «недели порабощенных народов». В недрах так называемого «Белорусского института науки и искусства» создан «восточный отдел», сотрудники которого фабрикуют различные антисоветские пасквили и распространяют их по каналам радиостанций «Свобода» и «Свободная Европа». С позволения сказать, «научная» продукция националистов отличается крайней тенденциозностью и грубой фальсификацией истории советского общества, особенно национальной политики КПСС. По признанию одного из старых пропагандистских боссов, председателя американского «Комитета политической информации» генерала Джексона, там действует своя логика. «В идеологической борьбе с коммунизмом, — откровенничает генерал, — нам нужна не правда, а подрывные действия: в такой войне потребуются все головорезы и гангстеры, которых мы можем заполучить тем или иным способом». Таково предназначение «научных центров» по изучению СССР, функционирующих в капиталистических странах.

Одним из основных направлений враждебной идеологической деятельности империалистического Запада стали попытки возбудить у советских народов националистические настроения, подорвать их дружбу, внести разлад в нашу многонациональную семью. В США вошло в практику ежегодное проведение так называемой «недели порабощенных народов», на которой националистическое отребье выступает с лозунгами отделения Литвы, Латвии, Эстонии, требует независимости Украины, Белоруссии и других советских республик. Националистов активно поддерживают официальные органы США. 5 апреля 1978 года конгрессмен Джозеф Адаббо, выступая в конгрессе по шпаргалке, подготовленной националистами, договорился до того, что Советская Белоруссия — это якобы «фиктивное государство», навязанное большевиками белорусскому народу вооруженным путем. И вкупе с националистами, чья «деятельность» на нашей земле в годы фашистской оккупации не забыта и по сей день белорусским народом, неразборчивые конгрессмены-антисоветчики продолжают твердить о «колониальном положении» Белоруссии.

Новая администрация Белого дома с первых своих шагов еще более заигрывает с антикоммунистами всех мастей. На торжества в Вашингтоне по случаю принятия Рейганом присяги были приглашены представители националистов. За оказанное им внимание и услуги они платят своим хозяевам провокациями и клеветой против СССР, пытаясь всячески опорочить исторические завоевания советского народа. В состав официальной делегации США на Мадридской конференции по безопасности и сотрудничеству в Европе вошли член конгресса М. Фенуик и юрист из штата Нью-Джерси М. Смородзки, которые представляли интересы белорусских и украинских националистов. Последний, возвратившись в США во время перерыва в работе конференции, в интервью газете «Беларус» хвастливо заявил: «Наша делегация еще до начала конференции много поработала, собирая материал о положении национальных республик СССР, о русификации, фактах нарушения прав человека и т. д. Мне лично неоднократно приходилось беседовать с представителями Белоруссии и в Нью-Джерси, и в Вашингтоне, и в Белом доме. Кроме того, американская делегация получила от белорусских организаций немало материалов о правах человека в Белоруссии. В Мадриде мы не пытались смягчить факты более дипломатическим языком». Это признание свидетельствует о том, что американский империализм в идеологической борьбе использует явную ложь и беззастенчивую демагогию, ибо какую информацию о положении в нашей республике могут дать, к примеру, в Нью-Джерси — этом прибежище бывших фашистских прислужников? Но тем не менее эту «информацию» часто подхватывают западные политологи, историки, политические деятели.

Империализм, создав мощный пропагандистский аппарат и широкую сеть «научных центров», пытается развернуть тотальное наступление против социализма. Достаточно отметить, что только информационное агентство США представляет собой организацию в 10 тысяч человек с бюджетом в 186,3 миллиона долларов. Принадлежащая агентству «Служба информационных центров» объединяет 301 пропагандистский пост в 111 странах. Еженедельно агентство публикует 400 тысяч листовок и брошюр на 47 языках и распространяет их в 115 странах. Оно же распространяет в 90 странах 24 журнала на 29 языках. Под эгидой агентства находится и снискавший сомнительную славу «Голос Америки», имеющий более 100 передатчиков в США и за их пределами, которые транслируют передачи на 38 языках в течение 845 часов в неделю. Только на языках народов Советского Союза передачи американских радиостанций ведутся свыше 93 часов в сутки.

Так практически осуществляется экспорт антикоммунистической идеологии во многие страны мира.

Противники социализма грубо извращают марксистско-ленинское учение об интернационализме, теоретические основы ленинской национальной политики, пытаются навязать представление о всесилии буржуазного национализма. Они отрицают добровольный характер объединения советских народов, доказывают, что якобы в основе этого объединения лежит принцип насилия как универсальный по своей сущности метод решения всех возникающих при социализме проблем; фальсифицируют суть советской федерации и национальной государственности, утверждают, будто национализм является движущей силой угнетенных наций и в настоящее время определяет пути общественного развития.

Буржуазные политологи стремятся прежде всего опорочить теоретические взгляды В. И. Ленина по национальному вопросу и политику КПСС. В. И. Ленину приписывается неисторический подход к определению нации и неправильное вскрытие причины национальных конфликтов, видимых им в материальных условиях жизни наций, а не в их национальной психологии.

Именно такую позицию отстаивают небезызвестные апологеты империализма А. Д. Лоу, Р. Пайпс, Б. Мейсснер, Е. Хакер, Л. Снайдер, Х. Сетон-Уотсон, К. Берг, Г. Бруннер, Э. Олуорт и другие. Они рассматривают нацию как природное, надклассовое явление, как коллективную личность, якобы имеющую особую душу, коренные свойства которой полностью детерминируют культуру нации и ее интересы.

В последнее десятилетие в буржуазной советологии наметились некоторые новые моменты в «теоретическом» истолковании сущности нации. В основу ее кладут этнические особенности, пренебрегая начисто социально-экономическими, классовыми факторами. По этому поводу написано немало страниц. В частности, Т. Хармстоун-Раковска, специально рассматривая вопрос «этничности в Советском Союзе», пришла к выводу, будто бы в СССР «этничность» является «главной побудительной силой изменений», то есть рождает национализм. Этот ложный тезис развивает и западногерманский социолог Г. Симон. Он смело заявляет, что на «этнической основе» в СССР растет «национализм как эмоционально окрашенное сознание», которое вряд ли зависит от экономических и классово-социальных факторов.

Советские ученые уже давно доказали нелепость подобных рассуждений, лженаучность и националистическую сущность таких концепций. Национальные отношения как часть общественных отношений определяются классовым содержанием. Именно с этих позиций В. И. Ленин, исходя из теоретического наследния К. Маркса и Ф. Энгельса, объяснял классовую сущность национальных взаимоотношений, точно определил историческое место и роль национальных движений в революционной борьбе пролетариата. В. И. Ленин указал путь преобразования наций, состоящих из антагонистических классов, в социалистические нации. При этом он одновременно охарактеризовал те исторические условия, при которых отдельные народности смогут стать социалистическими, минуя капитализм. Еще в 1914 году В. И. Ленин писал, что «нельзя из капитализма перейти к социализму, не ломая национальных рамок, как нельзя было из феодализма перейти к капитализму без национальных идей». Великий стратег пролетарской революции имел в виду, разумеется, не исчезновение национальных различий (как это ему приписывают буржуазные фальсификаторы), которое станет возможным в условиях коммунизма, а то, что «вся хозяйственная, политическая и духовная жизнь человечества все более интернационализируется уже при капитализме. Социализм целиком интернационализирует ее».

Нация в условиях капитализма не может иметь подлинного единства. Интернационализация при капитализме наталкивается на раздвоенность всей жизни наций буржуазного общества. Эту внутреннюю раздвоенность и ее межнациональный антагонизм может ликвидировать только социалистическая революция, которая, установив диктатуру пролетариата, в ходе строительства социализма уничтожает частную собственность, преобразует старые нации и народности в социалистические.

Противники социализма сфабриковали миф о том, якобы КПСС не признавала права наций на самоопределение. И хотя среди буржуазных политологов на этот счет существуют разные точки зрения, по сути они базируются на единой «теоретической» основе. Одно из определений звучит так: В. И. Ленин и партия большевиков якобы наделяли этим правом только высокоразвитые европейские нации, призванные совершить мировую пролетарскую революцию.

В последние годы пущена в оборот «новая» идея о том, что В. И. Ленин считал право наций на самоопределение «правом лишь для рабочего класса». Впервые ее выдвинул американский социолог В. Дадриан на VI Всемирном социологическом конгрессе, который проходил в 1966 году в Эвиане.

Среди антикоммунистов есть такие, которые, не осмеливаясь открыто отрицать общеизвестные факты, пытаются приписать Коммунистической партии прагматический подход к решению национального вопроса. Западногерманский социолог Б. Мейсснер, например, признает, что В. И. Ленин способствовал творческому обновлению и практическому осуществлению права наций на самоопределение. Но весь ход рассуждений буржуазного ученого направлен на то, чтобы доказать недоказуемое: Коммунистическая партия будто бы отошла от принципов, разработанных В. И. Лениным. «Тезис» о социалистической нации, по мнению Б. Мейсснера, с идеологической точки зрения облегчил возможность слияния русского национализма и коммунизма ленинского образца в рамках «советского патриотизма».

Этот же вздорный тезис пытается внушить читателям и член Британской академии наук, профессор русской истории Лондонского университета Х. Сетон-Уотсон в книге «Нации и государства. Исследование и происхождение наций и политики национализма». Сетон-Уотсон всю историю Советского государства излагает в главе, само название которой красноречиво говорит об «объективности» ученого — «От империи царей к Советской империи».

(Продолжение следует).

ЯК ГУЧАЛІ ПЕРШЫЯ

СВЕЦКІЯ БЕЛАРУСКІЯ ПЕСНІ

ВЯРТАННЕ СТАРОГА КАНТА

Бадай, мала хто з прыхільнікаў харавых спеваў, каму пашанцавала летась пабываць на канцэртах маскоўскага камернага хора «Віват», здагадваўся, што стаў удзельнікам своеасаблівай гістарычнай падзеі. У выкананні гэтага калектыву ўпершыню пасля шматгадовага забыцця прагучалі беларускія канты — свецкія бытавыя песні XVI—XIX стагоддзяў. Сабрала, «расшыфравала» і сістэматызавала іх выкладчык Белдзяржкансерваторыі Ларыса Касцюкавец. І новая праграма «Вівата» — гэта перш за ўсё вынік карпатлівых пошукаў і работы музыказнаўцы.

...Ніяк не магу ўлавіць, што за дзіўны інструмент суправаджае спевы. І толькі потым, праслухаўшы некалькі песень, дакараю сябе за няведанне: інструмента няма, ёсць толькі голас. Чароўны і разам з тым такі звычайны чалавечы голас. І няма з чым параўнаць народжаную ім музыку — гарманічную, глыбокую, з чыстымі тонамі і россыпам паўтонаў. Ці так спявалі сто, дзвесце, трыста гадоў назад? Ці так на самай справе гучаў беларускі кант?

— Напэўна сказаць не магу, ды і ніхто ўжо не зможа,— адказвае Ларыса Піліпаўна.— Рэстаўрацыя ў музыцы — працэс складаны, тут, акрамя ведаў, інтуіцыя, асаблівае пачуццё патрэбны. І ўсё-такі мне здаецца, што канты выконваліся менавіта так...

«Рэстаўрацыя» — не зусім звычайны тэрмін у музычным слоўніку, але іменна ён найбольш трапна вызначае сутнасць даследчай работы музыказнаўцы. Кант, што азначае ў перакладзе з лацінскай «спевы», «песня», спецыялісты па праву называюць з'явай славянскага Адраджэння. Развіццё культуры, асветы, кнігадрукавання абумовіла і з'яўленне своеасаблівай масавай песні: у аснове кантаў ляжалі прафесійныя паэтычныя тэксты, іх музыка вызначалася строгай кампазіцыяй, багатай распеўнасцю. Уключаныя ў склад першых песенных зборнікаў, у рэпертуар Батлейкі, разнастайныя па жанрах — віваты, лірычныя, жартоўныя, абрадавыя і г. д.— канты хутка распаўсюджваліся і станавіліся папулярнымі сярод розных слаёў насельніцтва. Яны сталі своеасаблівым мастком паміж песеннай народнай творчасцю і прафесійнай музыкай. Дарэчы, сучасныя гімны, песні пратэсту, маршы і славутае «Слаўся!» М. Глінкі па свайму характару не што іншае, як тыя ж канты.

Час не данёс да нас у чыстым выглядзе першыя свецкія беларускія песні. І справа не толькі ў тым, што не існавала тады гуказапісваючай апаратуры. Беларускім кантам выпаў нялёгкі лёс. Нарадзіўшыся ў час уздыму нацыянальна-вызваленчага руху, яны падзялілі потым лёс беларускай мовы, літаратуры, мастацтва. Іх знішчалі ў друкаваных зборніках, забаранялі спяваць на роднай мове. І канты разыходзіліся ў рукапісах па беламу свету, асядалі ў «глыбінцы», паступова набываючы рысы народных песень. Нібыта пацеркі ў пяску, рассыпаліся яны па часе і па зямлі.

Збіраць канты Ларыса Касцюкавец пачала яшчэ студэнткай у архівах, аддзелах рэдкіх кніг бібліятэк Мінска, Масквы, Ленінграда, Кіева, Вільнюса. Адшуквала старадаўнія нотныя рукапісы, зборнікі — усё, што мела адносіны да музычнай культуры Беларусі. Расшыфроўвала тэксты, якія старадаўнія «стэнаграфісты» занатоўвалі хуткапісам, ноты, што былі падобныя больш на таямнічыя знакі.

Узнагародай за гэту нялёгкую працу была знаходка ў ленінградскай бібліятэцы імя М. Салтыкова-Шчадрына — выдатны жартоўны кант пра літвінку, напісаны, як сцвярджаў рукапіс, беларускімі шкалярамі. Дарэчы, карпатлівая шматгадовая праца даследчыцы абярнулася і яшчэ адным нечаканым і карысным бокам: па ініцыятыве Л. Касцюкавец у Беларускай кансерваторыі быў арганізаваны факультатыўны курс палеаграфіі, дзе яна вучыць студэнтаў чытаць старажытныя рукапісы.

Адначасова музыказнаўца вяла пошукі і ў іншым напрамку. У рукапісу 1888 года «Сяляне мястэчка Моталь і іх песні» яго складальнік — настаўніца Марыя Саковіч паведамляла, што яна пачула тут многа рэдкіх напеваў, звязаных з абрадамі, сямейнымі святамі. Л. Касцюкавец паспрабавала аднавіць іх. На жаль, запісы настаўніцы аказаліся далёкімі ад прафесіяналізму. А Ларысе Піліпаўне так хацелася пачуць гучанне кантаў у «натуры»... Яна выпісала з рукапісу назвы і змест кантаў і ў час адной з фальклорных экспедыцый у Моталь распытала пра іх старых жыхароў. Многае за сто гадоў, вядома, забылася, але некаторыя песні захаваліся ў людской памяці, так з'явіліся ў музыказнаўцы абрадавыя, валачобныя канты.

Потым было яшчэ нямала экспедыцый у розныя куткі Беларусі, і пасля кожнай з іх пачынаўся старанны аналіз запісаў тэкстаў, музыкі, манеры выканання: бо частка кантаў фалькларызавалася, і вылучыць уласцівыя ім рысы ў «чыстым выглядзе» было зусім не проста.

Душа песні — у яе гучанні. Адшукваючы канты па рукапісах, працуючы над дысертацыяй, частка якой выйшла асобнай кнігай «Кантавая культура Беларусі», марыла Л. Касцюкавец пра тое, каб загучалі сабраныя ёю песні гэтак жа чыста і правільна, як і некалькі стагоддзяў назад. Не проста было знайсці выканаўцу, і не выпадкова выбар яе паў на камерны хор «Віват» з Масквы. Гэта, бадай, адзіны ў краіне аматарскі калектыў, які выконвае складанейшыя харавыя творы XVI—XIX стагоддзяў. А канты ж і спяваліся некалі людзьмі музычна адукаванымі, якія любілі і шанавалі песню.

Цяпер, калі з поспехам прайшлі канцэрты хора, калі на рэспубліканскім тэлебачанні падрыхтавана серыя перадач, прысвечаных кантавай культуры, ёсць у музыказнаўцы яшчэ адна мара — запісаць альбом грампласцінак «Музыка беларускага Адраджэння». Пакуль жа канты могуць пачуць на канцэртах і ў кабінеце народнай музыкі Белдзяржкансерваторыі толькі нямногія. А песні гэтыя вартыя таго, каб захаваць іх для нашчадкаў як цудоўны доказ пераемнасці культуры, якая існуе ў кожнага народа.

Святлана ГЕРАСІМАВА.

З КНІЖНАЙ ПАЛІЦЫ

«ЗЯРНЯТАК ЖМЕНЮ РАССЯВАЮ»

Цяпер часам здараецца: выходзіць кніга, а аўтару — крыху больш за дваццаць. Але што для паэта ўзрост?!

«Яшчэ малы»,—гаворыце
мне сёння,
А я, як палец меншы
ў кулаку...

Гэта радкі Віктара Шніпа са зборніка «Гронка святла», што выйшаў сёлета ў серыі «Першая кніга паэта». Аматар паэзіі задоўга да выхаду гэтай кніжкі меў магчымасць пазнаёміцца з вершамі паэта па даволі частых публікацыях у перыядычным друку. А засяродзіць сваю чытацкую цікавасць тут ёсць на чым: непаўторнасць, свежасць светаўспрымання, свая ўласная паэтычная інтанацыя.

Калі вырастае магутнае дрэва, дзівяцца з яго кроны, камля, але не заўсёды прыглядваюцца да глебы, карэнняў. Малады паэт мае надзейны грунт пад нагамі:

Абуджаць умею гоні,
Знаю, дзе зімуюць ракі...
Дзённік мой—мае далоні,
Мазалі — мае адзнакі.

І нараджаецца надзея, што сярод маладых з'явіўся паэт, які з часам здолее стаць цікавым не толькі пэўнаму колу аматараў паэзіі, але і выйдзе да шырокага чытача:

Хто цураецца радні,
Хто цураецца сяла,
Той як птах без вышыні,
Той як хата без цяпла.

У зборніку В. Шніпа няма шматаблічнасці, а значыць— і невыразнасці лірычнага героя, якая шкодзіць многім першым і не толькі першым кнігам. У чытацкую свядомасць большасць твораў В. Шніпа ўваходзіць неяк сціпла, але ўпэўнена.

У зборніку нямала паэтычных знаходак, але вы рэдка сустрэнеце тут тропы, якія могуць толькі здзівіць сваёй арыгінальнасцю. Яркі, свежы вобраз тут не проста сам па сабе, а часцей за ўсё нясе пэўную сэнсавую нагрузку.

Малады паэт з абвостранай увагай ставіцца да чалавека і чалавечнасці. У ягоным адным вершы сказана, што нават рэчка не перасыхае, «таму што ля ракі жыве яшчэ сівенькая бабуля».

В. Шніп умее надзяліць сілай сваё мастацкае слова. Вось характарыстыка фізічнага стану стомленага касьбой чалавека: «Ішоў дадому, як па кладцы». Або як трапна выкарыстаны дзеяслоў «світае»: «На мяккім узгорку падушкі світае снапок валасоў...» (гаворка ідзе пра дзіця).

Спрабуе свае сілы паэт і ў некласічных формах. Вось прыклад цікавага вольнага верша: «Тысячы гадоў назад нашу планету ўяўлялі плоскай, як даланя. Магчыма, яна такой была. Ды, відаць, з таго часу, як вынайшлі зброю, планета стала сціскацца... і сціснулася ў кулак».

Маладому паэту ўласцівыя абвостранае адчуванне навакольля, імкненне да самаўдасканальвання і ўдасканальвання жыцця. Тым больш гэта грунтоўна, што грамадзянская і творчая пазіцыя Віктара Шніпа выразная:

Непакоюся за ўсю Зямлю,
Не магу пражыць я
без'языка.

Яўген ЦУМАРАЎ.

У Брэсцкім абласным драматычным тэатры адбылася прэм'ера драмы «Апраўданне крыві» вядомага беларускага пісьменніка Івана Чыгрынава. У гэтым спектаклі, прысвечаным 40-годдзю вызвалення рэспублікі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, расказваецца пра пачатковы перыяд Вялікай Айчыннай вайны, пра маральную сілу савецкага чалавека, яго мужнасць і непахісную волю.
Паставіў спектакль заслужаны артыст БССР Сяргей Еўдашэнка.

НА ЗДЫМКАХ: І. ЧЫГРЫНАЎ сярод артыстаў пасля прэм'еры; сцэна са спектакля.

Фота Э. КАБЯКА.

ЗГАДКІ ПРА Ц. ГАРТНАГА

У апошні час з'яўляецца ўсё больш мемуарных зборнікаў, са старонак якіх паўстаюць незабыўныя абліччы вядомых пісьменнікаў, якіх ужо няма з намі, але яны назаўсёды засталіся ў гісторыі роднай літаратуры. Найбольшую цікавасць сярод падобных выданняў займаюць тыя, што расказваюць пра пачынальнікаў, напрыклад, зборнік «Успаміны пра Цішку Гартнага», які пабачыў свет у выдавецтве «Мастацкая літаратура».

Складальнікі яго Г. Жылуновіч і С. Александровіч сабралі шмат матэрыялаў, якія дазваляюць ва ўсёй паўнаце ўявіць шматгранную асобу Зміцера Жылуновіча (Цішкі Гартнага)—пісьменніка, вядомага дзеяча беларускай культуры, грамадскага дзеяча. Змешчаны ўспаміны, нататкі, артыкулы, якія паказваюць ролю Ц. Гартнага ў станаўленні нацыянальнай літаратуры.

Сярод аўтараў мемуарных нататак, эсэ—вядомыя беларускія пісьменнікі С. Грахоўскі, М. Лужанін, Я. Скрыган, С. Шушкевіч...

Складальнікі ўключылі ў зборнік і творы самога Ц. Гартнага — артыкулы «Дваццаць гадоў назад» і «За аглядам Парыжа», аб'яднаныя ў раздзеле «Публіцыстыка».

НА СЦЭНЕ— ЮНЫЯ ТАЛЕНТЫ

Такія канцэрты заўсёды карыстаюцца папулярнасцю, заўсёды збіраюць шмат гледачоў. У Дзяржаўным акадэмічным тэатры оперы і балета БССР адбыўся традыцыйны справаздачны канцэрт Беларускага харэаграфічнага вучылішча. У ім удзельнічалі навучэнцы аддзяленняў класічнага і народнага танца, вучні выпускных класаў. У канцэрце былі выкананы беларускія народныя танцы, рускі танец «Глушцы», урыўкі з класічных і сучасных балетаў.

У МАСКВЕ ЗАВЯРШЫЎСЯ

II МІЖНАРОДНЫ МУЗЫЧНЫ ФЕСТЫВАЛЬ

НІ МЕЖАЎ, НІ АДЛЕГЛАСЦЕЙ

У Маскве завяршыўся II Міжнародны музычны фестываль. Яго дэвіз — «Музыка за гуманізм, за мір і дружбу паміж народамі» — сабраў прагрэсіўных майстроў больш чым з 50 краін усіх кантынентаў. «Вялікае значэнне гэтага свята музыкі, якое сёння становіцца традыцыйным, — адзначыў К. У. Чарненка ў прывітанні ўдзельнікам і гасцям фестывалю.— Музыка — мастацтва, якое не патрабуе перакладу. Яна здольна аб'ядноўваць людзей, натхняць на подзвіг ў імя высакародных ідэалаў, узвышаць думкі і пачуцці».

— Я прыехаў у Маскву з краіны, расколатай выбухамі бомб і снарадаў, і вярнуся на маю спакутаваную радзіму, пераканаўшыся ў тым, што жыццё мацнейшае за смерць, дабро і справядлівасць мацнейшыя за насілле і зло, — пераканана гаворыць **Салім Муса САХАБ**, дырыжор і музыказнаўца з Лівана. Мы гутарым па-руску: Салім — выпускнік Маскоўскай кансерваторыі. — Агляд у Маскве, — першы, у якім мне давялося ўдзельнічаць, і я шчаслівы, што дэбютаваў на такім аўтарытэтным форуме. У яго выдатная рэпутацыя сярод музыкантаў свету, перш за ўсё дзякуючы яго гуманістычнай накіраванасці. «Музыка за гуманізм, за мір і дружбу паміж народамі» — якія чудоўныя і трапныя словы! Што можа быць для чалавека даражэй за мір, яснае неба над галавой? Мы ў Ліване адчуваем гэта асабліва востра.

У гісторыі маёй краіны многа трагічных старонак. Не магу без болю ўспамінаць тры доўгія месяцы, якія працягвалася асада Бейрута ізраільскімі акупантамі. Ліван — маленькая краіна, але спіс ахвяр агрэсіі вялікі і працягвае папаўняцца. Сярод многіх загінуўшых — мой калега, таленавіты музыкант Ахмед Мунаймні. Ён разам з усёй сваёй сям'ёй апынуўся пад руінамі разбуранага ўзрывам дома. У час блакады ў нас не было ні хлеба, ні вады, ні святла, але людзі заставаліся людзьмі, яны не здаваліся.

— Цяжка пераацаніць значэнне маскоўскага фестывалю, — лічыць амерыканскі музыкант **Фернанда ЛАІРЭС**, кіраўнік міжнароднага фартэпіяннага фестывалю. — Ён памог усім нам — удзельнікам і гасцям — лепш даведацца адзін пра аднаго, а менавіта ж на гэтым грунтуецца давер'е і дружба.

Кола спраў і клопатаў Фернанда Лаірэса шырокае: ён сумяшчае выкладчыцкую работу ў кансерваторыі Пібодзі ў Балціморы, старэйшай амерыканскай музычнай школе, з насычанай канцэртнай дзейнасцю, многа робіць для папулярызацыі творчасці кампазітараў розных краін.

— Нядаўна я зрабіў турнэ па ЗША, даў 30 канцэртаў у Сіэтлі, Філадэльфіі, Лос-Анджэлесе і іншых гарадах, — адзначае Ф. Лаірэс. — Многа ўвагі ўдзяляю абавязкам прэзідэнта Таварыства Ф. Ліста, якое, у прыватнасці, шырока прапагандуе ў ЗША рускую музыку як класічную, так і сучасную. Дарэчы, ганаровымі членамі нашай арганізацыі выбраны вядомыя савецкія кампазітары Р. Шчадрын, А. Эшпай, а Т. Хрэннікаў — член кансультатыўнага савета.

Савецкая кампазітарская школа мае багатыя традыцыі, якія бяруць пачатак у класіцы. Такія тытаны, як Чайкоўскі і Рахманінаў, вельмі папулярныя ў ЗША. Выконваюць мае студэнты і творы Скрабіна, Балакірава, Глазунова. У іх музыцы слухачам адкрываецца цудоўная душа рускага народа, а гэта так важна ў наш няпросты час.

—Я першы раз у Савецкім Саюзе, — гаворыць іспанскі кампазітар **Рамон БАРСЕ.** — І вельмі ўзрадаваўся, як толькі даведаўся, што ў мяне ёсць магчымасць прыняць удзел у музычным фестывалі. Як кампазітару мне вельмі прыемна, што на фестывалі быў выкананы мой твор — Жалобная музыка, прысвечаная памяці Эрнэста Чэ Гевары.

Многія іспанскія кампазітары, такія, як Агусцін Гансалес Асілу, Карлас Крус дэ Кастра, Хасеп Марыя Местэср Куадрэні і іншыя прымаюць актыўны ўдзел у антываенным руху. Мы выступаем супраць размяшчэння ў краінах Заходняй Еўропы новых амерыканскіх ядзерных ракет, за ліквідацыю амерыканскіх ваенных баз на тэрыторыі нашай краіны, за выхад Іспаніі з НАТО.

— У канцэртнай праграме маскоўскага фестывалю прагучаў мой Рэквіем памяці ахвяр фашызму ў Партугаліі, — гаворыць кампазітар з Партугаліі **Фернанда Лопіш ГРАСА**,— твор, які мне асабліва дарагі. Напісаны ён быў больш пяці гадоў назад, але за мяжой выконваецца ўпершыню. Тэма барацьбы з фашызмам — вядучая ў маёй творчасці.

На сёлетнім фестывалі мы з маім савецкім сябрам кампазітарам Аляксандрам Фляркоўскім успомнілі даўнюю гісторыю. У 50-я гады мне ўдалося выдаць у Партугаліі зборнік антыфашысцкіх песень, але практычна ўвесь тыраж быў канфіскаваны. На шчасце, адна з кніжак трапіла ў Маскву, і 24 мае песні, што вырваліся з засценка, былі выпушчаны ў савецкай сталіцы. Музычным рэдактарам зборніка стаў Фляркоўскі. Праз некалькі гадоў гэта выданне трапіла да мяне ў рукі, і я наглядна адчуў, якая гэта сіла — чалавечая салідарнасць. Назаўсёды зразумеў я і другое: музыка не ведае ні межаў, ні адлегласцей.

Інтэрв'ю ўзялі
С. БУТКОЎ і А. ДЖАЛАГОНІЯ.

Больш за сто дзяцей працаўнікоў калгасаў «Радунскі», «Савецкая Беларусь» і «Гарадзішча» Воранаўскага раёна займаюцца ў радунскай дзіцячай музычнай школе. Пад кіраўніцтвам вопытных педагогаў дзеці авалодваюць тэорыяй музыкі, вучацца іграць на баяне, акардэоне, фартэпіяна, скрыпцы, цымбалах. Тут створаны ўсе неабходныя ўмовы для заняткаў: добра абсталяваныя класы, разнастайныя тэхнічныя сродкі навучання, школа прадастаўляе для заняткаў дзецям музычныя інструменты.
НА ЗДЫМКУ: выкладчык па класу баяна Наталля БАХАР праводзіць урок са Светай МАСЕЛЬ.
Фота М. КАРЖУЕВА.

ЮБІЛЕЙНАЯ ВЫСТАЎКА АЛЯКСАНДРА КІШЧАНКІ

ПОЛЫМЯ НА ПАЛІТРЫ

Выстаўка з'явілася нечаканасцю і для яго калег па мастацтву, і для самай шырокай публікі, хаця з творчасцю гэтага майстра ў той ці іншай ступені знаёмы многія. Мінск упрыгожваюць мазаікі Аляксандра Кішчанкі, інтэр'еры грамадскіх будынкаў — створаныя ім габелены, яго жывапісныя работы ўваходзяць у экспазіцыю амаль што кожнай вялікай мастацкай выстаўкі. Чарговая адкрыла новыя абсягі творчасці мастака. Дарэчы, здзіўляць (хоць і не наўмысна) — у яго характары: яшчэ не сціхне хваля эмоцый, выкліканая апошняй работай, а ён ужо заняты новымі пошукамі.

— Часам я сам цяжка ўспрымаю ўласны жывапіс. Балюча глядзець на адкрыты колер, — кажа А. Кішчанка, — але ж тэмы, што мяне цікавяць, патрабуюць, на маю думку, менавіта такога падыходу. Крытэрыем каштоўнасці твора мастацтва не можа быць «падабаецца — не падабаецца» ці «я б гэта на сценку павесіў», мастацтва — ідэалогія.

На юбілейнай выстаўцы, прысвечанай 50-годдзю з дня нараджэння мастака, былі прадстаўлены жывапісныя творы розных перыядаў, і яны ўспрымаліся на першы погляд як работы розных аўтараў. Але гэта толькі на першы погляд. Розныя па стылістыцы творы Аляксандра Кішчанкі аб'ядноўвае цэльная мастацкая канцэпцыя: і ў трагічным, і ў лірычным ён сцвярджае Прыгажосць. Вось, напрыклад, карціна пад назвай «Плач». Вечная тэма ў сусветным мастацтве. У наш час звярталіся да яе Пікасо, Сікейрас, іншыя вядомыя майстры. Карціна А. Кішчанкі выклікае асацыяцыі з вобразам пакутуючай боскай маці на рускіх іконах. Мастак свядома звяртаецца да нацыянальнай мастацкай спадчыны. На Русі (у Расіі, на Беларусі і Ўкраіне) у сярэднявеччы і больш познія часы існавала дасканалая, распрацаваная стагоддзямі мастацкая сістэма, якая значна адрознівалася ад заходнееўрапейскай, хоць і мела з ёй агульныя карані. Каб адлюстраваць пачуцці, іканапісец звяртаўся да сімволікі жэста, колеру, глыбока асэнсаваны быў кожны атрыбут—свечка, світак з тэкстам, посах. Патрэбы ў ілюзорным адлюстраванні не было. Фармальна-кампазіцыйныя прынцыпы, распрацаваныя сотні гадоў назад, А. Кішчанка па-майстэрску скарыстоўвае ў карцінах на сучасныя тэмы, напрыклад, у рабоце «9 мая — Дзень Перамогі». На ёй жанчына з маленькім дзіцем на руках. Чорны колер фону, сіні—адзення ствараюць кантраст з залацістымі фарбамі твараў, рук... Маці з дзіцем тут — сімвал выратаванага Жыцця і адначасова сімвал гістарычнай пераемнасці розных пакаленняў абаронцаў Радзімы.

Радзіма-маці — у такім спалучэнні слоў ёсць глыбокі патрыятычны сэнс. Мабыць, воіны, што баранілі Маскву і Русь на Куліковым полі, успрымалі вобраз боскай маці таксама, як салдаты Савецкай Арміі плакат «Радзіма-маці кліча!». Сціплая па памерах карціна «9 мая — Дзень Перамогі» мае рысы манументальнасці, што, дарэчы, уласціва і такім станкавым творам мастака, як «Памяць подзвігу», «Гімн подзвігу». Работы гэтыя прысвечаны памяці трагічна загінуўшых касманаўтаў Дабравольскага, Волкава, Пацаева — гераічнага экіпажа арбітальнай станцыі «Салют-1».

Адна з найбольш цікавых работ А. Кішчанкі апошняга часу — «Змова». Яна аб адвечным супрацьстаянні дабра і зла, аб іх барацьбе.

Творчасць мастака-публіцыста — адно са шматлікіх звенняў у ланцугу абароны чалавечых каштоўнасцей. Яго творы на сацыяльныя тэмы «Ахвяра», «Апаганенне храма», «Разня ў Ліване», «Тэатр ваенных дзеянняў» успрымаюцца як рэпартаж з месца падзеі і як абагульнены вобраз сённяшняга складанага часу.

Шмат і плённа працуе мастак у жанры партрэта. У тварах розных людзей ён шукае нешта агульнае, што ўласціва сучаснаму чалавеку XX стагоддзя. Лічыцца, што перш чым пачынаць працу над партрэтам, трэба доўгі час вывучаць мадэль альбо добра ведаць асобу партрэтуемага. А. Кішчанка ў гэтым сэнсе больш спадзяецца на пачуцці, першыя ўражанні. У майстра ёсць партрэты, напісаныя наогул па памяці. Жыццёвы і прафесійны вопыт дазваляе мастаку з першай сустрэчы, з першага погляду адчуць характар чалавека.

Мастак імкнецца не да самавыяўлення, а да аб'ектыўнага адлюстравання рэчаіснасці. Гэта адзнака творчай сталасці.

Ёсць у экспазіцыі выстаўкі аўтапартрэт А. Кішчанкі. Мастак напісаў сябе ля акна майстэрні з палітраю ў руках. Фарбы на палітры ўздымаюцца ўгору язычкамі каляровага полымя. Яго жывапіс сапраўды палымяны, сагрэты ўнутранай цеплынёй, прасякнуты захапленнем перад Прыгажосцю, трывогай за будучыню свету.

Пётра ВАСІЛЕЎСКІ.

НА ЗДЫМКАХ: А. КІШЧАНКА (справа) і пісьменнік У. КАРАТКЕВІЧ у выставачнай зале Палаца мастацтва; А. КІШЧАНКА. «Партрэт пісьменніка М. Шолахава».

Фота Я. КОКТЫША.

крынічка

СТАРОНКА ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ

Георгій ШЫЛОВІЧ

ПАЎЛІК ЕДЗЕ Ў ГОСЦІ

Да гэтага дня Паўліку здавалася, што тата ведае ўсё на свеце. Пра што ні папытаеш, ён заўсёды адкажа, растлумачыць.

Аднаго разу Паўлік пацікавіўся: «Тата, чаму раніцай сонца ўзыходзіць, а вечарам — заходзіць?» «А гэта для таго, — усміхнуўся тата, — каб ты ведаў, калі трэба ўставаць, а калі — класціся спаць».

Паўлік тады адразу паглядзеў на будзільнік-пузанчык, што весела цікаў на стале. Звечара мама заўсёды падкручвала яго, каб не праспаць. Выходзіць, на сонца не дужа спадзявалася.

А сёння Паўлік яшчэ спаў, калі тата ціха выслізнуў з-пад коўдры. Падышоў да тэлефона, набраў нумар:

— Алё, вакзал? Скажыце, калі ласка, «Генерал Даватар» ідзе да Зялёнага?

Татаў голас, а затым і званок будзільніка разбудзілі Паўліка. Ён расплюшчыў вочы, зажмурыўся ад сонечнага святла. Хацеў павярнуцца на другі бок, але пачуў, як тата гаворыць па тэлефоне:

— Не, мяне «Генерал Даватар» цікавіць. Калі адыходзіць?.. Ага, зразумеў. Дзякуй!..

«Праспаў!» — працяла Паўліка роспачная думка, і ён пачаў хуценька адзявацца.

Учора дамовіліся з татам з'ездзіць на электрычцы ў Зялёнае. У піянерскі лагер да сястрычкі Надзі. Там сёння свята. Вялікі касцёр будзе на лясной паляне. Героі вайны прыедуць у госці, партызаны...

— Малайчына, ты ўжо на нагах! — пахваліў тата, вярнуўшыся ў спальню. — Скачаш, бачу, як сапраўдны кавалерыст. Так, так, сынку, сонца прыспешвае: пара і нам па конях.

— Па конях? — здзівіўся Паўлік.

Ён, маленькі жыхар вялікага горада, яшчэ ніколі не ездзіў на кані. Ні верхам, ні ў вазку. Самастойна — толькі на трохколавым веласіпедзе. Калі, вядома, не лічыць трамвая, аўтобуса і тралейбуса. Яшчэ ў кабіне вялізнага МАЗа давялося пракаціцца. Гэта летась было, калі тата браў яго з сабой на першамайскую дэманстрацыю. У калоне метрабудаўцаў ішлі. «А неўзабаве, — паабяцаў тады тата, — і пад зямлёй праедзем з табой. Як здадзім падземку. Да свята вызвалення рэспублікі. Рубеж, сынку, не абы-які! Сорак гадоў якраз міне з таго часу, як прагналі з нашай зямлі фашыстаў».

Паўлік ведае: тата слоў на вецер не кідае. Калі паабяцае — ніколі не падвядзе. Вось і зараз яны спяшаюцца на вакзал. Туды, дзе іх чакае блакітна-зіхатлівая электрычка з сіняй палоскай літар на баку.

— «Ге-не-рал Леў Мі-хай-ла-віч Да-ва-тар», — чытае Паўлік па складах. — Дык вось пра якога каня-скакуна гаварыў тата! Пра электрычку! — здагадваецца ён і пытае: — А Даватар хто быў?

— Герой вайны, кавалерыст. З Віцебшчыны, наш славуты зямляк, — расказвае тата. — Некалі Маскву ад ворагаў абараняў. І загінуў там... Каля сяла Палашкіна...

Плаўна адыходзіць электрычка, амаль нячутна.

— Тата! — раптам усхопліваецца Паўлік. — А Даватараў конь дзе? Таксама забілі фашысты?

— Напэўна, сынку...

— А як звалі каня?

І гэта Паўлік таксама хоча ведаць. Але тата не адказвае. Доўга маўчыць, нібы прыслухоўваецца, як глухавата пастукваюць колы: тах-так, тах-так...

Паўлік едзе ў госці... Можа, там што пачуе пра Даватара і пра яго каня? Надзеі не траціць. І роспытамі больш не надакучае: дарога закалыхвае яго на татавых руках.

Летняя пара для дзятвы заўсёды жаданая. Хлопчыкі і дзяўчынкі едуць у госці да сваіх бабуль і дзядуль у вёску, з бацькамі і настаўнікамі ходзяць у турыстычныя паходы, праводзяць свой адпачынак у піянерскіх лагерах. І заўсёды іх верныя спадарожнікі — вясёлыя гульні, песні, смех. Сярод любімых забаў — збіраць кветкі і плесці вянкі, што так да твару дзяўчынкам, якіх вы бачыце на фотаздымку.

Фота Ж. ВАЙТОВІЧ.

Анатоль ГРАЧАНІКАЎ

Заспявалі
І травы,
І кветкі
На шырокіх
Зарэчных
Лугах.
Над прыціхлай
Ракой
На палеткі
Іх мядовы
Струменіцца
Пах.
Чыстым
Ранішнім
Сонцам
Сагрэта,
Кветка кожная
Ў росах блішчыць.
Светла-звонкая
Музыка
Лета
У зялёным
Прасторы
Гучыць.

Васіль ЗУЁНАК

ЗОРКІ ВЫПАЛІ Ў БАРЫ

Вы не бачылі, сябры,—
Зоркі выпалі ў бары!
Дзе ні глянеш
на паляне —
Ўсё гарыць чырвоным
ззяннем.
Пад лістамі, ля пянькоў —
Сотні зыркіх аганькоў.

Свецяцца жарынкі —
Цёплыя смяшынкі,
Сонечныя дочкі —
Зваблівыя вочкі.

У бары, у бары
Дол увесь іскрыцца,
У бары, у бары
Выспелі суніцы!

Станіслаў ШУШКЕВІЧ

НЕ БЫЛІ МЫ Ў АФРЫЦЫ

— Пацямнелі тварыкі,
Пацямнелі ножкі...
Дзе ж вы загарэлі,
Міленькія крошкі!
Мо былі вы ў Афрыцы!
Можа, ў Інданезіі!
Вы адкуль прыехалі!
Вы адкуль прывезены!
Толькі вочкі сінія,
Сінія, глыбокія...
Пэўна, вы паўднёвыя,
Пэўна, вы далёкія!
— Мы жывём у садзіку,
Садзіку дзіцячым.
Хіба ж там ніколі
Нас ніхто не бачыў!
Гэта ж наша сонейка
Нас ласкава грэла,
Загарэлі тварыкі,
Пацямнела цела.
Не былі мы ў Афрыцы,
Не былі і ў Азіі,
Вось на гэтым дворыку
Бегалі і лазілі.

АГАРОД

Выцірала бабка пот,
Даглядала агарод:
І фасолю-спавітушку,
І пятрушку, і чарнушку,
Рэпку, рэдзьку, буракі,
Мак, салату, агуркі,
І капусту, ды і ўкроп,
Часначок, цыбулю, боб,
Гарбузы і памідоры,
У старой работы — горы.
Працаваць адной дакука,
Кліча бабка ўнучку, ўнука —
І палоць, і паліваць,
Прарываць і аграбаць,
Укалола ўнучка ручку
І аб рэпку, і аб бручку,
Укалола язычок
Аб зялёны часначок...
Унучка слёзы выцірае
Ды на вулку паглядае.
Пастаяў, як цецярук,
Улюбёны ў бабку ўнук,
Сеў на градку наш бядак
І латошыць боб і мак.
Выцірала бабка пот,
Даглядала агарод.

ПЕСЕНЬКА ПРА БУСЛА

Словы А. ВЯРЦІНСКАГА *Музыка І. ЛУЧАНКА*

Луг зялёны неабсяжны...
А ў тым лузе ходзіць важны,
Ходзіць, бродзіць, ходзіць, бродзіць бусел,
Ходзіць бусел цэлы дзень.
Гэты бусел асаблівы.
Толькі з намі ён шчаслівы.
Ён за намі ходзіць, ходзіць.
Ён за намі ходзіць, ходзіць.
Ходзіць, нібы цень.

Ён і лётае, і кружыць,
Ён нас любіць, з намі дружыць.
І як толькі прыйдзем, толькі прыйдзем,
Толькі прыйдзем мы на луг,
Ён спявае і клякоча,
Танцаваць ён з намі хоча...
Ён наш самы, самы добры,
Ён наш самы, самы добры,
Самы добры друг.

Луг зялёны неабсяжны...
А ў тым лузе ходзіць важны,
Ходзіць, бродзіць, ходзіць, бродзіць бусел,
Ходзіць бусел цэлы дзень.
Гэты бусел асаблівы.
Толькі з намі ён шчаслівы.
Бусел белы, бусел светлы,
Бусел белы, бусел светлы,
Светлы, як прамень.

Марыана МІРКІНА

БЕРАСЦЯНЫ КАРЭЦ

Пайшлі Міша з татам у лес. Было горача. Міша захацеў піць. Пад абрывам цурчаў ручаёк.

— Шкада, няма кубка, — засмуціўся Міша.

Тата адарваў кавалак бярозты, скруціў яго, праткнуў тонкім дубчыкам.

— Вось табе кубак, сынок, — сказаў тата. — Пі, колькі хочаш!

Напіліся яны вады, а берасцяны карэц ля ручайка пакінулі.

— Спатрэбіцца тым, хто пасля нас сюды завітае, — сказаў тата.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ

НАШ АДРАС:
МІНСК-ГСП, ЛЕНІНСКІ ПРАСПЕКТ, 44.
ТЭЛЕФОНЫ: 33-01-97, 33-02-80, 33-03-15, 33-16-56, 33-07-82.

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.
Зак. 943